УДК 261.7

# КАМУ СЁННЯ ЗАМІНАЕ КРЫЖ, АЛЬБО СУЧАСНЫЯ АНТЫХРЫСЦІЯНСКІЯ ПАСТАВЫ Ў ЕЎРОПЕ XXI СТАГОДДЗЯ

**Аношка Сяргей Анатольевіч,**
Uniwersytet Kardynała Stefana Wyszyńskiego (Warszawa, Polska)

*Апостал Павел пісаў “бо не паслаў мяне Хрыстос хрысціць, але несці добрую вестку, не ў мудрасці слова, каб не адмяніць крыжа Хрыстова. Бо слова крыжа для тых, што ідуць у пагібель, ёсць вар’яцтва, а тым, што ідуць у збаўленне, – сіла Божая!” [6, с. 1008]. Словы, што былі спісаныя амаль дзве тысячы гадоў таму, сёння зноў актуальныя. У XXI ст. у сённяшняе Еўропе, на жаль, усё часцей можна пабачыць і стаць сведкам таго, як, здавалася б, прасунутыя еўрапейскія эліты, розныя фонды па абароне правоў грамадзян, NGO, а нават некаторыя гандлёвыя сеткі і карпарацыі спрабуюць цалкам прыбраць галоўны хрысціянскі сімвал з публічнай прасторы.*

Галоўным тэзісам, які часта становіцца няўдольнай спробаю тлумачэння такіх пастаў, ёсць імкненне руху ў бок дабрабыту і абароны правоў рэлігійных меншасцей і няверуючых. Паводле такой логікі, крыж можа замінаць людзям з іншым светапоглядам, які розніцца ад хрысціянскай веры. У той самы час тыя ж абаронцы нейтральнасці і палітычнай карэктнасці чамусьці вельмі часта забываюцца на тое, што акрамя хрысціянскай сімволікі ў публічнай сферы Еўропы прысутнічае таксама шэраг знакаў і лагатыпаў іншых рэлігійных сістэм і вераванняў, ідэалогій ды поглядаў, але тое ім акурат ужо, маўляў, не перашкаджае.

Хрысціянства для еўра-атлантычнай цывілізацыі, да якой належыць таксама і сучасная Беларусь, заўсёды было і пакуль яшчэ надаль застаецца катэгарычным імператывам, які вызначае маральныя аксіёмы для яе жыхароў. Праўда, секулярызацыя, што пакрысе распаўсюджваецца ў заходнім свеце, а таксама фактар т.зв. паліткарэктнасці садзейнічаюць сёння таму, каб у памяці жыхароў Еўропы не засталося нічога, што магло б атаясамлівацца з хрысціянскім падмуркам нашай цывілізацыі [4, с. 95–96]. Дзеля таго, каб убачыць, якім чынам сёння ў Еўропе, якая, здавалася б, непарыўна звязана з хрысціянскай цывілізацыяй і спадчынай[1], ідзе барацьба з крыжом, варта прывесці толькі некаторыя прыклады з апошніх гадоў, што датычаць розных дзяржаў нашага кантыненту.



**Рыс. 1.** Упакоўка без крыжа на царкве з Lidl (злева) і рэальны здымак грэцкай царквы (справа)

У красавіку 2012 г. улады футбольнага клуба Real Madrid пасля падпісання кантракту з National Bank of Abu Dhabi пастанавілі прыбраць крыж з лагатыпу сваёй каманды, каб не дражніць мусульман. Крыж, які падараваў клубу яшчэ кароль Іспаніі

[1] У 2004 г. трывалі дыскусіі наконт таго, каб у прэамбуле Канстытуцыі Еўрасаюза змясціць узгадванне пра хрысціянскія карэнні Еўропы, пра што прасіў нават сам папа Ян Павел II. Канстытуцыя – дакумент свецкі, у якім не варта размяшчаць узгадванняў пра пытанні веры і маралі, казалі тады адны, без ісламу і юдаізму такое ўзгадванне не будзе мець сэнсу, казалі іншыя. Канстытуцыя апынулася глядзець у будучыню, але ігнаравала гістарычнае мінулае, як тое трапна было зазначана ў афіцыйным ватыканскім выданні L’Osservatore Romano. Пазіцыю рыма-католікаў падзяляў і Алексій II, тагачасны Патрыярх РПЦ, які назваў Асноўны закон Еўрасаюза бездухоўным [5, с. 371].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Рыс. 2.** Піктаграма базылікі Sacré-Coeur перад зменамі RATP (злева) і цяперашні від (справа)

Альфонс XIII у 1920 г., знік у тым ліку і з афіцыйных прамацыйных ды рэкламных матэрыялаў ФК Real. Іспанская спартыўная газета Marca тады пісала, што хрысціянскі сімвал прыбралі, каб “пазбегнуць любой формы блытаніны ці няправільнай інтэрпрэтацыі” ў рэгіёне, дзе большасць складаюць мусульмане [2, с. 91].

У лістападзе 2014 г. дайшло да прафанацыі крыжа непасрэдна ўжо ў самім Ватыкане. Скандальная арганізацыя Femen вырашыла ў знак пратэсту супраць выступлення пантыфіка Францішка ў Еўрапарламенце арганізаваць акцыю на плошчы св. Пятра. Распранутыя жанчыны, стоячы на каленях, трымалі крыжы ў руках, здзяйснялі вульгарныя жэсты і выкрыквалі “Твая вера – трымай яе ўнутры”; удзельніц затрымала паліцыя. Двума гадамі раней “актывісткі” спілавалі 4-метровы праваслаўны крыж у Кіеве [3, с. 23].

У 2017 г. двойчы здарыўся скандал з нямецкай гандлёвай сеткай Lidl. Спачатку з упаковак грэцкіх тавараў знік крыж, які аздабляе знакамітыя праваслаўныя цэрквы на выспе Сантарыні, месяц пазней сітуацыя паўтарылася ў рэкламе крамы, дзе з’явіўся касцёл св. Антонія з лігурыйскай мясцовасці Дольчэаква ў Італіі, але ўжо без традыцыйнага крыжа на даху святыні. У тым самым месяцы крыж знік з упаковак грэцкага ёгурту вытворчасці кампаніі Nestlé.

У пачатку 2018 г. стала вядома, што Дырэкцыя парыжскага транспарту (RATP) вырашыла на экранах фунікулёра, што возіць турыстаў на Манмартр, увесці змены. Раней на маніторах з’яўляліся карцінкі сабора з крыжамі наверсе. Аднак пад ціскам французскай Рады Стану, якая пільнуе, каб аніводзін рэлігійны сімвал не быў прысутны ў публічнай прасторы, RATP вырашыла змяніць эмблему Sacré-Coeur. Сам відарыс застаўся амаль без змен, але – як лёгка здагадацца – зніклі крыжы, а замест іх зараз па-над дахамі базылікі лунае самотны голуб з аліўкавай галінкай. У некаторых еўрапейскіх краінах сёння даходзіць амаль да вар’яцкіх сітуацый. Так, былы галоўны канкурэнт А. Меркель і прэтэндэнт на пасаду канцлера Нямеччыны сацыяліст Марцін Шульц яшчэ ў сваю бытнасць старшынёй Еўрапейскага парламенту (2012–2017) неаднаразова заяўляў пра тое, што публічныя месцы павінны заставацца нейтральнымі, а, значыць, крыжы трэба адусюль папрыбіраць.

У падобным духу нядаўна разгарнулася барацьба з крыжом на помніку Яну Паўлу II у французскай мяцовасці Плоермель (фр. Ploërmel) у Брэтані. Рада Стану, што з’яўляецца вышэйшым органам адміністрацыйнага судаводства ў Францыі, пацвердзіла ў канцы 2017 г. вырак суда з Рэн (сталіца рэгіёну Брэтань) з 2015 г. аб тым, што паводле закону аб падзеле Касцёла і дзяржавы [1, с. 135] трэба прыбраць крыж, які аздабляе помнік пантыфіку, бо стаіць у публічным месцы. 22 студзеня 2018 г. прыйшлі навіны з французскай мясцовасці ў дэпартаменце Па-дэ-Кале – Сэнцінэль (фр. Sentinelle). Пасля рэнавацыі і рамонту касцёла св. Барбары, занесенага ў спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА, “дзіўным” чынам знік крыж, што заўважылі самі месцічы. Замест яго на даху ўсталявалі маланкаадвод. Архітэктар, які займаўся рамонтам, патлумачыў зніkненне крыжа тым, што, як ён палічыў, тая фігура нічога не ўносіць да агульнага відарысу будынка.

Пералічаныя антыхрысціянскія паставы з’яўляюцца толькі малой часткаю той велізарнай вайны, якую сёння разгарнулі на Захадзе барацьбіты за нейтральнасць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і паліткарэктнасць. Гэтым людзям замінаюць крыжы ў будынках судоў (Нямеччына), на шыі дыктараў тэлебачання (Нарвегія), і нават на дзяржаўнах сцягах (Швецыя). Усё тое, несумненна, у будучыні можа прывесці да таго, што мячэць Парыжскай Божай Маці стане не толькі раманам-антыўтопіяй, але рэчаіснасцю сённяшняй заходняй цывілізацыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. *Drake, H.* Contemporary France [Тэкст] / H. Drake. – London; New York: Palgrave Macmillan, 2011. – 256 p.

2. *Ibrahim, R.* Crucified Again: Exposing Islam's New War on Christians [Тэкст] / R. Ibrahim. – Washington: Regnery Publishing, Inc., 2013. – 256 p.

3. *Smiet, K.* One Size Fits All? Femen and the Limits of Secular Feminism [Тэкст] / K. Smiet // Gender and Activism: Women's Voices in Political Debate: Yearbook of Women's History 35. – Amsterdam: Hilversum, 2015. – P. 15-34.

4. *Краснов, М. А.* Христианство и права человека [Тэкст]: компендиум / М. А. Краснов. – М.-Берлин: Директ-Медиа, 2015. – 147 с.

5. *Левяш, И. Я.* Глобальный мир и геополитика. Культурно-цивилизационное измерение [Тэкст]: в 2 кн. / И. Я. Левяш. – Минск: Беларуская навука, 2012. – Кн. 1. – 485 с.

6. *Першы ліст да Карынцянаў* / Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў [Тэкст]. – Мінск: Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, 2012. – 1120 с.